ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (762) ● Пятніца, 21 лістапада ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

## Сёння ў нумары

● У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА ● НА ПАРАДКУ ДНЯ—ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК ● ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ ● СПАДЧЫНА ІЛЬІЧА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ БДУ ● ДАРОГАЙ СЛЕДАПЫТАЎ ● НА ПАЭТЫЧНАЙ ХВАЛІ ● ЦІКАВА ВЕДАЦЬ.

## ДОБРЫ ПАЧАТАК

Днямі ў парткоме адбылася нарада загадчыкаў кафедр, на якой разгледжана пытанне аб пастаноўцы выхаваўчай работы сярод студэнтаў.

Удзельнікі нарады падзяліліся вопытам, выказалі прапановы і пажаданні па паляпшэнню стану выхаваўчай дзейнасці кафедр, стварэнню неабходных умоў для больш эфектыўнай работы.

Выказана аднадушнае меркаванне аб каштоўнасці такіх нарад і прадаўжэнні гэтага добрага пачатку.

## ВЫСОКАЯ АДЗНАКА

У нашым калектыве вельмі шмат людзей, якія не ўяўляюць жыцця без грамадскай работы. Яны добрасумленна, з вялікай адказнасцю выконваюць шматлікія даручэнні, працуюць у грамадскіх камісіях, удзельнічаюць у нарадах і сходах і асабістымі справамі выконваюць ленінскія запаветы. Да ліку такіх актывістаў ужо многа год належыць дацэнт кафедры гісторыі СССР, член ЦК прафсаюза работнікаў вышэйшай школы і навуковых устаноў Марыя Парфіраўна Баранава.

Нядаўна па даручэнню Прэзідыума ВЦСПС адказны сакратар Мінскага абласнога савета прафсаюза М. К. Новікаў уручыў Марыі Парфіраўне Ганаровую грамату за актыўную працу і ў сувязі з 50-годдзем прафсаюза.

Мы горача віншуем Марыю Парфіраўну і жадаем ёй многа сіл, здароўя, поспехаў у яе карыснай дзейнасці.




НА ЗДЫМКУ: лепшыя студэнты фізічнага факультэта: (злева направа) В. ГАМСЯНОК, Г. БАРАНАЎ, Б. БАЗЫЛЕЎ, Э. ТАБАЧНІК, Т. ФЁДАРАВА, Е. БЯЛОРЦАЎ, Н. БЯРОЗА, В. БЯЗРУКАЎ, Т. ЧУПРАКОВА, А. МІНЬКО, А. СІТНОЎ, Ф. БАРАВІК, Л. БАБЕНЯ, Э. ДОЎНАР. Фота Г. Марозава.

# ГОД ЮБІЛЕЙНЫ, ЛЕНІНСКІ

Ленінскі юбілейны год зойме дастойнае месца ў гісторыі нашай дзяржавы. Сведчаннем гэтага з'яўляецца шырока разгорнутая падрыхтоўка да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча. Падпарадкаваць усю работу сустрэчы юбілею правадыра — вось нашы задачы ў цяперашнім навучальным годзе. Ён будзе асаблівым у жыцці універсітэта. Выкладчыкі ўзялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар знамянальнай даты. Студэнты рыхтуюць свае працоўныя індывідуальныя і групавыя падарункі Леніну.

Пазнаць кожны канкрэтны выпадак з ленінскай практыкі, пранікнуць у творчую лабараторыю Ільіча — мэта і сэнс жыцця нашага студэнцтва.

Год 1970 павінен стаць годам абавязковага ажыццяўлення дэвіза «Жыць, працаваць і вучыцца па-ленінску!» Для гэтага неабходна ўсю ўвагу сканцэнтраваць на яшчэ не вырашаных пытаннях, дабіцца ў гэтым навучальным годзе найбольш высокай паспяховасці студэнтаў. Таму ўжо цяпер трэба выявіць у групах патэнцыяльных двоечнікаў і тых, каго задавальняюць пасрэдныя адзнакі, абмеркаваць узровень іх падрыхтоўкі да сесіі на пасяджэннях кафедр і камсамольскіх сходах і аказаць дапамогу адстаючым усімі сродкамі дзеля забеспячэння высокай паспяховасці.

Дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедр павінны ўзмацніць кантроль за падрыхтоўкай навукова-педагагічных кадраў, за работай аспірантаў.

Да гэтага часу адной з прычын нізкай паспяховасці студэнтаў з'яўляецца недастаткова высокі ўзровень метадычнай работы. Зацверджанае ў мінулым годзе саветам універсітэта палажэнне аб навукова-метадычнай рабоце не знайшло яшчэ поўнага прымянення ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Метадычная работа на факультэтах патрабуе самых дзейсных мер паляпшэння. Трэба ўсямерна садзейнічаць выпрацоўцы ў студэнтаў навыкаў эксперыментальнай работы, умення крытычна аналізаваць агрэхі эксперыментаў, вучыць своечасова і дакладна фіксаваць умовы вопыту і хутка апрацоўваць вынікі. Важна ўжо на малодшых курсах вучыць студэнтаў пісаць навукова-даследчыя артыкулы, змястоўна і кампактна фармуліраваць вывады.

Заслугоўвае ўвагі і такі метад павышэння ведаў студэнтаў, як далучэнне іх да педагагічнай работы ў якасці памочнікаў выкладчыкаў пры тлумачэнні некаторых пытанняў курсаў.

Асаблівай увагі патрабуе падрыхтоўка студэнтаў першага і другога курсаў. Для матэматыкаў, напрыклад, трэба арганізоўваць алімпіяды па рашэнню складаных задач, дзе гэта магчыма, уключаць навукова-даследчую работу ў вучэбныя планы, праводзіць факультатыўныя лекцыі па спецыяльнасці, далучаць студэнтаў да правядзення дадатковых лабараторных работ.

Шырока і дзейсна трэба разгарнуць ідэалагічную работу, усямерна ўмацоўваць камуністычную перакананасць, патрыятызм і інтэрнацыяналізм студэнтаў, іх стойкасць і ўменне супрацьстаяць любым формам буржуазнай ідэалогіі.

У ленінскі год ва універсітэце, які носіць імя вялікага Леніна, як мага больш студэнтаў павінна прыняць удзел ва ўсесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ, прысвечаным знамянальнай даце. Справа гонару кожнага — здаць ленінскі залік толькі на добра і выдатна.

Год ленінскага юбілею трэба сустрэць і правесці па-ленінску.



*Усё, што звязана з імем вялікага правадыра, дорага кожнаму сумленнаму чалавеку. Савецкія людзі, госці з далёкіх і блізкіх краін, бываючы ў Ленінградзе, заўсёды наведваюць тыя мясціны, дзе жыў і працаваў Уладзімір Ільіч.*

*НА ЗДЫМКУ: студэнты з нашага універсітэта каля дома, у якім з 4 (17) красавіка па 5(18) ліпеня 1917 года жыў У. І. Ленін.*

*Фота Д. ПРЭСА.*

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

У СЕРАДУ, 26 ЛІСТАПАДА, А 15-Й ГАДЗІНЕ Ў АКТАВАЙ ЗАЛЕ ГАЛОЎНАГА КОРПУСА АДБУДЗЕЦЦА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД УНІВЕРСІТЭТА.

**НА ПАВЕСТЦЫ ДНЯ:**

1. СПРАВАЗДАЧА АБ РАБОЦЕ ПАРТКОМА (ДАКЛАД Т. Я. ДУДАРАВАЙ).
2. ВЫБАРЫ ПАРТКОМА.

## КАМСАМОЛЬСКАЕ ДАРУЧЭННЕ КОЖНАМУ

На пасяджэнні бюро камітэта камсамола, якое адбылося нядаўна, абмеркаван ход выканання мерапрыемстваў, накіраваных на дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Была заслухана інфармацыя камсорга 2-й групы III курса юрыдычнага факультэта О. Канопка аб падрыхтоўцы камсамольцаў да святкавання вялікай даты.

У групе юрыстаў удзяляецца вялікая ўвага вучэбна-выхаваўчай рабоце, яна абмяркоўваецца на камсамольскіх сходах. Назіраецца цяга студэнтаў да авалодання грамадскімі навукамі. Многія камсамольцы рыхтуюць даклады па ленінскай тэматыцы.

Разам з тым бюро камітэта камсамола адзначыла і шэраг недахопаў у рабоце студэнцкай групы. Было ўказана, напрыклад, на нясвоечасовую распрацоўку планавых мерапрыемстваў. А многае запланаванае не адпавядае належным патрабаванням, не вызначаецца канкрэтнасцю (адсутнічаюць даты правядзення мерапрыемстваў, не ўказаны прозвішчы камсамольцаў, якія адказваюць за іх ажыццяўленне). У групе ні адзін камсамолец не прыняў асабістых абавязацельстваў. На сходзе не абмяркоўвалася выкананне камсамольцамі даручэнняў і прынятых раней пастаноў. У групе не практыкавалася і грамадская атэстацыя членаў ВЛКСМ.

У прынятай пастанове бюро камітэта камсамола рэкамендуе камсамольскаму бюро юрфака прааналізаваць планы мерапрыемстваў груп і курсаў і абмеркаваць іх да 16 снежня. Кантроль даручана весці арганізацыйнаму сектару камітэта камсамола універсітэта. У пастанове ўказваецца таксама, што камітэтам камсамола факультэтаў неабходна да 16 снежня падрыхтаваць і правесці сходы ў групах з павесткай дня аб асабістых абавязацельствах кожнага камсамольца.

Групкамсоргі, курсавыя і факультэцкія камсамольскія бюро павінны звярнуць увагу на работу ў падшэфных школах і на прадпрыемствах. Трэба дабіцца таго, каб кожны камсамолец удзельнічаў у лекцыйнай прапагандзе.

В. СВІРКО.

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# ЗАЎСЁДЫ НА ПЯРЭДНІМ КРАІ



Здаецца, што гэта было зусім нядаўна, хоць і прайшло ўжо 33 гады. Тады мне, асістэнту кафедры, упершыню давялося пазнаёміцца з Паўлам Рыгоравічам Пятровічам. Ён быў старастай у студэнцкай групе заолагаў на біялагічным факультэце. У той час гэта група лічылася настолькі падрыхтаванай, дысцыплінаванай і ініцыятыўнай, што мы, выкладчыкі, заўсёды з асаблівай адказнасцю рыхтаваліся да правядзення тут заняткаў.

Цяпер Павел Рыгоравіч ужо каля 16 год кіруе работай факультэта і ў апошні час загадвае кафедрай заалогіі беспазваночных.

Выхадзец з сялянскай сям'і (нарадзіўся ён у вёсцы Лучнікі Слуцкага раёна Мінскай вобласці), Павел Рыгоравіч выбраў настаўніцкі шлях. У 1929 годзе пасля заканчэння Слуцкага педагагічнага тэхнікума ён стаў настаўнікам пачатковай школы ў Жыткавіцкім раёне, а праз чатыры гады паступіў на біялагічны факультэт нашага ўніверсітэта.

Яшчэ ў студэнцкія гады Павел Рыгоравіч сур'ёзна заняўся навуковай работай на кафедры заалогіі беспазваночных, неаднаразова ўдзельнічаў у экспедыцыях па вывучэнню планктона азёр Беларусі. Першая навуковая работа выканана ім у студэнцкія гады і была апублікавана ў «Зоологическом журнале».

Закончана вучоба ва універсітэце. І зноў выкладчыцкая работа, але ўжо на кафедры заалогіі Гомельскага педагагічнага інстытута, поўнасцю захоплівае П. Р. Пятровіча. А праз год, у цяжкую, суровую зіму 1939 года, інстытуцкую аўдыторыю прыйшлося змяніць на фронт. Пачалася вайна з белафінамі. Павел Рыгоравіч удзельнічае ў баях пад Ленінградам і Выбаргам, і толькі цяжкае раненне выводзіць яго са строю. Цаной неверагодных намаганняў і медыцынскага майстэрства маскоўскіх хірургаў жыццё яго было выратавана. Пасля доўгага лячэння — вяртанне да педагагічнай работы ў Гомельскім педагагічным інстытуце.

Але мірны час аказаўся кароткім. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Павел Рыгоравіч кіруе эвакуацыяй інстытута ў глыб краіны. Выканаўшы гэтае заданне, ён па накіраванню едзе ў Маскву і працуе тут у Батанічным садзе Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі пад кіраўніцтвам акадэміка Н. В. Цыцына.

Пасля выгнання фашыстаў Павел Рыгоравіч вяртаецца ў Беларусь. З 1946 года працуе на біялагічным факультэце універсітэта спачатку старшым выкладчыкам, пасля дацэнтам, а з 1953 года — дэканам факультэта. На працягу многіх год Павел Рыгоравіч нязменна ўзначальваў факультэцкую партыйную арганізацыю. Аўтарытэт, веды, вопыт, арганізатарскія здольнасці як нельга лепш спалучаюцца ў гэтым чалавеку і дазваляюць яму паспяхова рашаць мноства складаных і адказных задач. Гэта шматгранная дзейнасць перш за ўсё выявілася ў наладжванні працоўнай дысцыпліны на факультэце ва ўмовах няспыннага росту кантынгента студэнтаў, значнага ўскладнення сістэм навучання, шырокай падрыхтоўкі навуковых кадраў праз аспірантуру.

Акрамя таго, вучэбная работа патрабавала перыядычнага перагляду вучэбных планаў, арганізацыі і камплектавання новых кафедр (генетыкі і дарвінізма, мікрабіялогіі і вірусалогіі, біяхіміі і біяфізікі) і раду эксперыментальных лабараторый. І тут кіраўніку факультэта патрэбна было валодаць вялікай мэтанакіраванасцю, настойлівасцю, высокай прынцыповасцю.

Нягледзячы на такую адміністрацыйную нагрузку, Павел Рыгоравіч вядзе вялікую навукова-даследчую работу на кафедры заалогіі беспазваночных па вывучэнню гідрабіялагічных асаблівасцей вадаёмаў БССР. Гэтыя даследаванні з'яўляюцца састаўной часткай комплексу эксперыментальных работ, якія праводзяцца кафедрай для абгрунтавання мерапрыемстваў па рацыяналізацыі рыбнай гаспадаркі рэспублікі.

Шматгадовая плённая праца Паўла Рыгоравіча адзначана медалем «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне», Граматай Вярхоўнага Савета БССР і ордэнам Леніна.

Плённая праца універсітэцкага калектыву ў развіцці навукі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў адзначана ганаровай узнагародай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У гэтую вялікую калектыўную працу ўнёс свой значны ўклад і Павел Рыгоравіч Пятровіч.

Пажадаем ад усяго сэрца дарагому юбіляру ў дзень шасцідзесяцігоддзя моцнага здароўя, доўгіх год жыцця, асабістага шчасця і такой жа цвёрдасці, мэтанакіраванасці і настойлівасці ў працы на факультэце, якую праяўляў ён да гэтага часу.

С. КАЛІШЭВІЧ,
дацэнт.

# РАННІЯ ВЫДАННІ У. І. ЛЕНІНА Ў ФОНДАХ БІБЛІЯТЭКІ БДУ

Ленин В. Избранные статьи и речи в 4-х томах. Второе изд., дополненное. М., «Московский рабочий», 1925—1924.

3 т. (Московский комитет РКП).
Т. 1. М., 1925. 361 стр.
Т. 2. М., 1924. 680 стр.
Т. 3. М., 1924. 702 стр.

Ленин (Вл. Ильин). За 12 лет. Собрание статей. Том 1. Два направления в русском марксизме и русской социал-демократии. Пг. Изд. Петрогр. Совета Рабочих и Красноарм. депутатов., 1918. 496 стр.

Ленин (В. Ульянов). Избранные статьи по национальному вопросу. М.-П. Госиздат. 1923. 188 стр.

Ленин, Н. (В. И. Ульянов). На пути к Октябрю. Сборник. Л. Раб. изд. «Прибой», 1925. 190 стр.

Ленин, В. И. Новый курс. (Речи и статьи). Екатеринбург, Уральск. облуправл., 1921. 132 стр.

Ленин, В. И. О международном рабочем движении. Сборник статей. Т. 2, 3. С предисловием Н. Л. Мещерякова. М.-Л. Госиздат, 1925. Т. 2, 1925. 244 стр. Т. 2, 1925. 146 стр.

Ленин, В. И. О партийном строительстве. Статьи и речи за 20 лет. Предисл. и примеч. К. П. Новицкой. Изд. 2-е, дополн. М.-Л., Госиздат, 1925. 591 стр.

Ленин, Н. Основы марксизма. Краснодар. кооперативное изд. «Буревестник». 1925. 54 стр.

Ленин, В. И. (Ульянов). Революция и культура. (Статьи, речи, цитаты). Под ред. В. Аптекаря и Н. Майорского. М., «Октябрь мысли», 1924. 181 стр.

Ленин (В. И. Ульянов). Речи и статьи. Пособие для школы политграмоты и совпартшкол., М., «Красная новь», 1924. 605 стр.

Ленин, В. (В. Ульянов). Социалистическая революция и задачи просвещения. (Статьи и речи). 3-е дополн. изд. М.-Л., Госиздат., 1925. 111 стр.

Ленин, Н. (В. Ульянов) Тематика большевизма. (Избранные статьи и речи 1905—1923). М., «Моск. рабочий», 1923. 580 стр.

Ленин В. Этапы рабочего и профессионального движения в России. (Сборник статей и речей). Сост. Анатольев. Предисловие Лядова. М., «Пролетарий», 1925.

Ленин (Влад. Ульянов). Аграрная программа социал-демократов в первой Русской Революции 1905—7 годов. Второе издание. М.-Пг., Книгоиздательство «Коммунист», 1919. 251 стр.

Ленин, Н. (В. И. Ульянов). Годы реакции и подъема. Л., Раб. изд. «Прибой», 1925. 251 стр.

Ильин, В. (Н. Ленин). Государство и революция. Учение марксизма о государстве и задачи пролетариата в революции. Выпуск I. Пг., Книгоиздат. «Жизнь и знание», 1918. 113 стр.

Ленин Н. Две тактики социал-демократии в демократической революции. Со вступительной статьей В. Быстрянского: Н. Ленин и буржуазная революция в России. Л., Раб. изд. «Прибой», 1925. 184 стр.

Ленин, Н. Детская болезнь «левизны» в коммунизме. Л. Госиздат. 1920. 110 стр.

Ленин, Вл. Империализм как новейший этап капитализма. (Популярный очерк). М., Госиздат, 1917. 109 стр.

Ленин, Н. Империализм как новейший этап капитализма. М. Госиздат., 1924. 90 стр.

Ленин, Н. Карл. Маркс. Краткий биографический очерк с изложением марксизма. М., Изд. «Красная Новь», Главполитпросвет, 1922. 24 стр.

Ленин, Н. (В. Ульянов). Крах II Интернационала. Сборник статей. М.-Л., Госиздат, 1925. 269 стр.

Ленин В. (Вл. Ильин). Материализм и эмпириокритицизм. Критические заметки об одной реакционной философии. М., «Звено», 1909. 317 стр.

Л. ПЯЛЕВІНА,
ст. бібліёграф.



*Калектыў журфака падтрымлівае цесную сувязь з рэдактарамі рэспубліканскіх, абласных, раённых газет. Журналісты дзеляцца вопытам са студэнтамі, удзельнічаюць у навуковых пасяджэннях, нарадах, канферэнцыях.*

*НА ЗДЫМКУ: (на пярэднім плане) рэдактар газеты «Звязда» М. І. Дзялец і рэдактар «Советской Белоруссии» А. К. Зінін на пасяджэнні вучонага савета.*

Фота Л. КАЛЮЖНАЙ.

# ПЕРШЫЯ КРОКІ

Трэці паверх галоўнага корпуса універсітэта — царства матэматыкаў. Сюды мы прыйшлі, каб пазнаёміцца з сённяшнімі першакурснікамі, будучымі кавалеўскімі і эйнштэйнамі.

Падыходзім да дзвярэй аўдыторыі якраз у той момант, калі раздаўся званок. Калідор напаўняецца гоманам. Выбіраем невысокую бялявую дзяўчыну, знаёмімся. Міла Папова ахвотна расказвае пра сваіх сяброў:

— Добрыя, дружныя рабяты. Я ў гэтым пераканалася яшчэ на ўборцы бульбы, дзе мы асабліва пасябравалі.

— Цяжка вучыцца?

— Вядома, многія прадметы незнаёмы, але мы не разачароўваемся.

Да нас падыходзіць Валерый Панкоў, камсорг дзевятай групы. Просім яго расказаць аб першых месяцах універсітэцкага жыцця.

— У нашай групе 30 чалавек, у асноўным тыя, хто закончыў школу ў гэтым годзе. Усе актыўна ўключыліся ў грамадскую работу. Ужо правялі камсамольскі сход, на якім выбрана бюро, падведзены вынікі работы ў калгасе. Запланавалі наведаць Дом-музей I з'езда РСДРП, Дзяржаўны мастацкі музей, мемарыяльны комплекс у вёсцы Хатынь. Правялі поўную падпіску на газеты.

— А як наконт вучобы?

— Цяжкавата. Бадай, самае складанае — пераключыцца са школьнай сістэмы на універсітэцкую. Але цяпер уваходзім у каляіну. Вось прыходзьце да нас на практычныя заняткі і паглядзіце самі.

Мы так і зрабілі...

333-я аўдыторыя. Практычныя заняткі па вышэйшай алгебры ў дзевятай групе. Тэма: «Паняцце алгебраічнай аперацыі». Адзін за другім выходзяць да дошкі Лісоўская, Акуневіч, Вольберт.

Адказы не зусім упэўненыя. Многа даводзіцца гаварыць самому выкладчыку, бо рабяты яшчэ не прывыклі да поўнай самастойнасці, робяць першыя крокі. Галоўнае — ім цікава, а гэта значыць, што справы наладзяцца.

Нашу ўвагу прыцягнула рухавая чарнавокая дзяўчына. Яна неяк асабліва ўважліва слухала тлумачэнні выкладчыка, нешта запісвала ў сшытак. На перапынку мы даведаліся, што гэта Света Кузьміч.

— Света, скажы, калі ласка, як ты адчувала сябе ў першыя дні заняткаў ва універсітэце?

— Мне здавалася, што я ў другі раз трапіла ў першы клас: многа было незразумелага. Праўда, паступова ўцягваюся, паспяваю запісваць лекцыі, ужо не такія страшныя практычныя заняткі.

Кола субяседнікаў непрыкметна пашыраецца. Размова становіцца ўсё больш ажыўленай. Рабяты расказваюць аб сваіх планах на будучае, скардзяцца, што некаторым цяжка даюцца гуманітарныя навукі: замежная мова, гісторыя. Аднак адчуваецца, што яны не згубілі і наўрад ці згубяць ужо той запал, з якім прыйшлі сюды.

У камітэце камсамола факультэта дапоўнілі характарыстыку першакурснікаў:

— Выдатныя рабяты, добра зарэкамендавалі сябе на сельскагаспадарчых работах.

— Мне падабаецца ў нашых першакурснікаў іх баявітасць, — гаворыць Антон Шчыпцоў, намеснік старшыні прафкома, — хоць гэта і прыносіць нам нямала клопатаў. Многія, як толькі пасяліліся ў інтэрнаце, адразу ж пачалі прад'яўляць патрабаванні: няма швейнай машыны, не заўсёды бывае гарачая вада і г. д. Прыйшлося ім растлумачыць, што гэта часовыя непаладкі.

Вельмі актыўныя рабяты. Прыкладам можа быць прафсаюзная канферэнцыя, на якой яны многа і добра выступалі, дыскуціравалі наконт выбараў у прафбюро.

— Вось Антон гаварыў, што першакурснікі баявыя, актыўныя, — уступае ў гаворку Леў Гарэлік, старшыня спортбюро. Але чаму ж многія не палічылі патрэбным з'явіцца на асенні крос? З 30 чалавек дзевятай групы прыйшло толькі 17. Думаецца, таму, што рабяты яшчэ не разумеюць усёй адказнасці, якая лягла на іх у той момант, калі ім выдалі студэнцкія білеты.

Як бачым, калектыўны партрэт першакурснікаў матфака атрымаўся даволі каларытны. Наперадзе ў іх нялёгкія гады вучобы, радасці і расчараванні, трывогі і надзеі. Але хочацца верыць, што праз пяць год мы сустрэнем з дыпломамі ў руках і Мілу, і Валеру, і Свету — усіх тых, з кім пазнаёміліся сёння.

А. ЛАМЕКА,
Л. ПЕРАСЫПКІНА,
студэнткі журфака.

# 100 АД МІНСКА ДА ШУШАНСКАГА

## ШЛЯХ ДАЛЁКІ, ЗАХАПЛЯЮЧЫ

Нашым людзям дорага літаральна ўсё, звязанае з жыццём і дзейнасцю Ільіча. Таму ідэя наведаць месцы, дзе калі-небудзь жыў, працаваў і спыняўся праездам Ленін, была аднадушна падтрымана на кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Меркавалася аб'ехаць усю краіну, сабраць вялікі матэрыял пра жыццё правадыра — расказы людзей, якія асабіста ведалі яго, фотаздымкі, магнітафонныя запісы — і выкарыстаць гэты скарб у дні падрыхтоўкі да святкавання ленінскага юбілею.

Узначаліў каманду энтузіястаў загадчык кабінета гісторыі КПСС У. П. Белакосаў. Самыя дужыя і вынослівыя — студэнты і навуковыя работнікі вну сталіцы рэспублікі — увайшлі тады, у мінулым годзе, у састаў каманды мотаралі. Шлях ляжаў на Поўнач.

За месяц — гэта было ў жніўні — праехалі на матацыклах усе паўночныя раёны краіны ад Ленінграда да Выбарга. У Ленінградзе наведалі шэраг музеяў, былыя канспіратыўныя кватэры Уладзіміра Ільіча. Запомнілася ўзбярэжжа Фінскага заліва. Тут асабліва многа памятных мясцін, звязаных з рэвалюцыйнай дзейнасцю Леніна...

Расказ аб гэтым паходзе быў апублікаваны ва універсітэцкай шматтыражцы.

Але гэта была хоць і асабліва важная, але невялікая частка шляху. Сёлета маршрут пралёг на ўсход, у Сібір.

Рыхтаваліся да яго з дапамогай кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Канечны пункт — апошняе месца ссылкі Ільіча — сяло Шушанскае.

Жадаючых удзельнічаць у паходзе было яшчэ больш, чым у мінулым годзе, — звыш 40 чалавек. Усю зіму для іх чыталі лекцыі па гісторыі партыі, эканоміцы і геаграфіі раёнаў, па якіх быў пракладзены маршрут, і спецыяльна — па мотаваджэнню. Потым правялі экзамены, і дзесяць самых дастойных атрымалі права ўдзельнічаць у паходзе.

Зіма прайшла ў падрыхтоўцы, вырашэнні тысяч розных пытанняў — тэхнічных, фінансавых, арганізацыйных. Нарэшце маршрут і састаў каманды зацверджаны рашэннем ЦК ЛКСМБ і Белсаветам па турызму. Самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы прымаў камітэт камсамола БДУ. У абкомы камсамола па шляху следавання былі разасланы пісьмы з просьбай садзейнічаць беларускім следапытам у зборы патрэбных матэрыялаў. Здаецца, усё. У далёкую дарогу гатовы...

І вось урачыстыя правады на мінскім стадыёне «Дынама». На трыбунах тысячы людзей. У. Белакосаў аддае рапарт старшыні Белсавета па турызму П. Н. Багданаву. Дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах уручаюць букеты кветак... На электрычным табло ўзнікаюць словы прывітання і пажадання ўдзельнікам ралі. Было ўрачыста і хвалююча. Пад апладысменты гледачоў строгай калонай, несучы на галаўной машыне сцяг БССР, прайшлі круг гонару па бегавой дарожцы стадыёна. Пачаўся шлях, далёкі і захапляючы...

Вечарам спыніліся на начлег у лесе. Цішыня... У вушах яшчэ шуміць ад няспыннага рокату матораў.

Але адпачываць рана. У кожнага свае абавязкі. Ля агню завіхаецца кастравы. Лепшы спадарожнік турыста — чайнік ужо кіпіць. Камандзір з камісарам Міхаілам Яшкіным удакладняюць маршрут і задачу на заўтрашні дзень. З машынамі возіцца Эдуард Хадасевіч, студэнт політэхнічнага інстытута. Яму, старшаму механіку, заўсёды многа работы.

Наперадзе тысячы кіламетраў цікавага маршруту, дзесяткі сустрэч з людзьмі, якія працавалі з Ільічом. А гэтыя першыя кіламетры да Масквы былі па сутнасці кіламетрамі знаёмства з новымі абставінамі жыцця. Людзі прывыкалі рухацца ў калоне машыны трымалі свой экзамен...

## ПОЦІСКІ РУК

Масква...

Гранітныя пліты Чырвонай плошчы. Колькі ім гадоў? Колькі людзей, колькі пакаленняў прайшло тут!.. Па іх праходзіў Ленін... Хваляванне міжволі кранае сэрца.

Ля Маўзалея, як заўсёды, мнагалюдная чарга. Мора кветак, якія прынеслі сюды прадстаўнікі з розных краін свету. У руках мотатурыстаў букеты кветак, сабраныя на палях Аршаншчыны, у лясах за Смаленскам. Яны леглі на граніт Маўзалея... Звоняць куранты. Зладжаным крокам прайшоў каравул да паста № 1.

Разам з беларускімі турыстамі ідуць юнакі з Масквы, прадстаўнікі Цэнтральнага клуба мотатурыстаў, спартыўныя камісіі. Усяго ў паходзе «Іскра», арганізаваным рэдакцыяй часопіса «За рулём», удзельнічала 14 каманд з розных гарадоў краіны. Самы далёкі маршрут быў у каманды з Мінска.

Тут, на Краснай плошчы, сустрэліся з украінскімі мотатурыстамі, якія ідуць па таму ж маршруту. Ад усёй душы павіншавалі камсамольцаў-кіяўлян з 50-годдзем камсамола Украіны.

У Маскве наведалі рэдакцыю часопіса «За рулём». Удакладнілі маршрут.

Вечарам у Цэнтральным доме мотатурыстаў з добрымі пажаданнямі і сяброўскімі парадамі перад следапытамі Беларусі і Украіны выступілі заслужаны майстар спорту П. Разжывін, спартыўны камісар ралі «Іскра» Б. Дземчанка.

На наступны дзень падарожнікаў чакалі Горкі Ленінскія. Тут мемарыяльны музей. Навакол — стары парк са стогадовымі ліпамі, алеямі, па якіх хадзіў Ільіч. У Горках ён адпачываў, лячыўся і працаваў. А з 15 мая 1923 года і да апошніх дзён Уладзімір Ільіч пастаянна жыў у Горках.

Штодзённа музей наведваюць дзесяткі экскурсій з усіх рэспублік краіны.

Рабочы кабінет. Скромная дзелавая абстаноўка. На сцяне — тэлефон, па якім Ленін размаўляў з Масквой. Усюды кнігі, кнігі: на паліцах, этажэрках, рабочым стале. Хворы, Ільіч многа працаваў: чытаў, пісаў артыкулы, даваў указанні і парады.

На лесвіцах у будынку падвойныя поручні. Яны зроблены па просьбе Леніна, каб яму, хвораму, было лягчэй узнімацца, трымаючыся абедзвюма рукамі. Гэта адзіная рэканструкцыя ў доме.

Ленінскія прастата і сціпласць кідаюцца ў вочы на кожным кроку. Непасрэднае знаёмства з мясцінамі, звязанымі з напружанай дзейнасцю, з умовамі асабістага жыцця Леніна, нараджала глыбокія пачуцці здзіўлення і захаплення геніяльнасцю правадыра і яго чалавечнасцю.

Цікава ўспомніць лічбы, прыведзеныя ЮНЕСКО: ва ўсіх краінах свету выдадзена 343.882 тысячы экземпляраў твораў Леніна. Сярод перакладной літаратуры яго творы займаюць першае месца ў свеце, і колькасць выдадзеных твораў ніводнага пісьменніка ці грамадскага дзеяча не набліжаецца да гэтай лічбы...

Па дарозе ў Горкі агледзелі старажытны Уладзімір. Тут у 1893 годзе праездам спыняўся Уладзімір Ільіч...

Адразу за горадам дагнаў дождж. Паліў, быццам з вядра. Ноч правялі ў палатках, якія наскрозь прамоклі.

А з ранку ўсіх будзіў жвавы Міхаіл Серада:

— Уставайце, уставайце ж — надвор'е лётнае! Сушыцца хутчэй! — Ён заўсёды стамляўся менш за іншых.

У былым Ніжнім Ноўгарадзе Ленін з 1893 па 1900 год бываў неаднаразова ў сувязі з выданнем газеты «Іскра», кіраваў рэвалюцыйным рухам ніжнегародцаў. Праз Н. А. Рукавішнікаву і Л. Н. Ванеева ён адсюль атрымліваў нелегальную літаратуру, калі знаходзіўся ў Шушанскім. Усе будынкі, дзе бываў Ленін, беражліва захоўваюцца. У іх створаны музеі. На кожным доме — мемарыяльная дошка.

У горадзе нафтахімікаў Кстове ўдзельнікаў экспедыцыі сустракалі рабочыя, прадстаўнікі камсамольскіх арганізацый, піянеры лагера «Ясная паляна». Беларускія падарожнікі былі гасцямі піянераў. У. Белакосаў расказаў аб мэце і назначэнні экспедыцыі «Іскра», прачытаў лекцыю аб Мінску, аб тройчы ардэнаноснай Беларусі. Гаспадары выступілі з канцэртам.

На развітанне піянеры прапанавалі ўдзельнікам паходу адкрыць памятным запісам альбом ганаровых гасцей лагера.

Невялікі, чысты і вельмі ўтульны горад Чабаксары асабліва запомніўся першым спатканнем з Волгай. Тут яна вельмі шырокая. Ледзь прыкметнай стужкай на небасхіле віднеецца супрацьлеглы бераг...

Паром праз Волгу ходзіць кожныя 20 хвілін. А плылі, напэўна, цэлую гадзіну. Вада празрыстая, чыстая, сцюдзёная. Такой і ўяўлялася яна многім.

На тым беразе — Зеленагорск. Далей шлях лёг уздоўж берага Волгі. Цудоўныя мясціны!

Хутка Казань. Гасцінныя гаспадары радасна сустракалі экспедыцыю. І ў першую чаргу запрасілі наведаць універсітэт, у якім вучыўся Ленін. Казанскі універсітэт быў адкрыты 167 гадоў назад. У той час, калі тут вучыўся Валодзя Ульянаў, універсітэт быў пад апекай царскага ўрада з прычыны «неблаганадзейнасці прафесараў і небяспекі духу». Пасля вядомых снежаньскіх студэнцкіх хваляванняў у ліку першых быў выключаны з універсітэта Уладзімір Ульянаў. Першым месцам ссылкі для яго стала вёска Какушкіна, што ў сарака кіламетрах ад Казані. Там ён пражыў амаль год.

У Казані адбылася сустрэча мотатурыстаў з гвардыі палкоўнікам С. С. Пшанічным, які вызваляў Мінск у 1944 годзе. Ён многа расказваў пра тыя незабыўныя падзеі. Вечарам да прычала Казані падышоў электраход «Беларусь», які курсіруе па маршруту Казань—Куйбышаў. У кают-кампаніі адбылася цёплая таварыская сустрэча землякоў.

## НА РАДЗІМЕ ПРАВАДЫРА

Ульянаўск у гэтыя дні — быццам гіганцкая будаўнічая пляцоўка. Ён увесь у рыштаваннях.

Хуткімі тэмпамі ўзводзіцца мемарыяльны цэнтр. На ударнай камсамольскай будоўлі ні на хвіліну ні днём, ні ноччу не сціхае наладжаны працоўны рытм. Лепшым сынам камсамола даверана адказная будоўля. Тут можна сустрэць і шмат беларусаў — юнакоў і дзяўчат з Мінска, Гродзенскай, Віцебскай, Гомельскай і іншых абласцей.

— Перадайце прывітанне Беларусі, — наказвалі землякі.

А ульянаўцы запрашалі наведаць радзіму правадыра праз год:

— Тады вы не пазнаеце наш горад...

Ва Ульянаўску асабліва многа трэба было агледзець. Акуратна зазнялі на плёнку домік, дзе нарадзіўся і правёў юнацкія гады Уладзімір Ільіч.

Вось гімназія, у якой вучыўся Валодзя Ульянаў. Зала, дзе ў 1887 годзе ён здаваў экзамен на атэстат сталасці. Парта, за якой ён сядзеў...

Цяпер тут школа № 1. У 1966 годзе яна першай са школ СССР была ўзнагароджана ордэнам Леніна. Хутка тут будзе створаны яшчэ адзін музей правадыра.

Ва Ульянаўску закончыўся першы этап экспедыцыі «Іскра». Падведзены папярэднія вынікі. Сюды прыйшлі 14 мотакаманд краіны. Па каштоўнасці сабраных матэрыялаў ленінскай тэматыкі, па колькасці наведаных музеяў, сустрэч з людзьмі, якія ведалі Ільіча, па працягласці пройдзенага шляху — асноўных відах спаборніцтва — каманда з Беларусі заняла другое месца, уступіўшы першынство ленінградцам.

**В. ФЕРАНЦ,**
**студэнт журфака.**

**(Заканчэнне ў наступным нумары).**









**Кожны дзень паходу быў насычаны самымі разнастайнымі справамі.**

Фота **У. Белакосава.**

## У вну краіны

⊙ **Група лектараў-леніназнаўцаў Казанскага дзяржаўнага універсітэта зрабіла паездку ў Маскву, каб пазнаёміцца з маскоўскім перыядам жыцця У. І. Леніна. Група пабывала ў Маўзалеі У. І. Леніна, наведала цэнтральны музей У. І. Леніна, крамлёўскі кабінет і кватэру Уладзіміра Ільіча, зрабіла паездку ў Горкі.**

⊙ **Супрацоўнікі Ленінградскага музея-архіва Д. І. Мендзялеева рыхтуюцца да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Цяпер яны заняты арганізацыяй выстаўкі «Ленін і яго паплечнікі хімікі». У экспазіцыю будуць уключаны матэрыялы, сабраныя пры дапамозе вучоных тэхналагічнага інстытута імя Ленсавета.**

⊙ **У Савецкі Саюз для азнаямлення з пастаноўкай вышэйшай адукацыі і правядзення навуковай работы ў вну СССР прыбылі два прафесары з Індыі Манамар і Каракодзі. Яны пабывалі ў Алмаацінскім політэхнічным інстытуце, Маскоўскім энергетычным і дзесяць дзён правялі ў Ленінградскім політэхнічным інстытуце.**

⊙ **Члены гістарычнага гуртка маскоўскага Вышэйшага тэхнічнага вучылішча імя Баўмана правялі паход па месцах баёў 3-й Маскоўскай камуністычнай дывізіі. Маршрут праходзіў па Ноўгарадскай вобласці, праз г. Тарту. Матэрыял, сабраны ў выніку гэтага паходу, — значны ўклад у напісанне гісторыі МВТВ імя Баўмана.**

